# Школьная планета

***НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!***

***№ 8 І чвэрць 2017/2018 навуч. года***

*Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”Мінскай вобласці*


# Фінансавая граматнасць




## СПЕЦЫЯЛЬНЫ ПРАЕКТ

## ФІНАНСАВАЯ АЗБУКА

**НАЗАПАШВАННЕ** - ператварэнне часткі даходаў у капітал, павелічэнне запасаў матэрыялаў, маёмасці, грашовых сродкаў, нарошчванне капіталу, асноўных сродкаў дзяржавай, прадпрыемствамі, прадпрымальнікамі, хатнімі гаспадаркамі. Вопыт паказвае, што на назапашванне варта накіроўваць прыкладна 20% даходаў.



**ПАДАТКІ** - гэта абавязковыя плацяжы, што спаганяюцца дзяржавай з фізічных і юрыдычных асоб у дзяржаўныя і мясцовыя бюджэты. З'яўляюцца адной з формаў фінансавых адносін, якія забяспечваюць размеркаванне і пераразмеркаванне нацыянальнага даходу ў адпаведнасці з эканамічнымі і сацыяльнымі задачамі. Падаткі дзеляцца на прамыя, якімі абкладваюцца даходы і маёмасць (падаходны падатак), і ўскосныя падаткі на тавары і паслугі, якія ўсталёўваюцца ў выглядзе надбаўкі да цаны.

**Ведай свае грошы!**



# ЯК ПРАВЕРЫЦЬ САПРАЎДНАСЦЬ БАНКНОТ

## Першы спосаб. Правяраем навобмацак.







**Металаграфскі друк.** **Меткі для людзей з аслабленым зрокам.**

Усе банкноты маюць павялічаную таўшчыню фарбавага слоя, дзякуючы чаму добра ўспрымаюцца навобмацак

## Другі спосаб. Правяраем пры нахіле.













“РБ”; у залежнасці ад кута агляду на літарах і фоне назіраецца пераход ад негатыўнай да пазітыўнай выявы

Ведай свае грошы!

НАЦЫЯНАЛЬНЫ БАНК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# ЯК ПРАВЕРЫЦЬ САПРАЎДНАСЦЬ БАНКНОТ

## Трэці спосаб. Правяраем на прасвет.



**Вадзяны знак**

Мае графічныя скажэнні. Бачны ў адлюстраваным святле. Бачны ў УФП.



**Ахоўная ніць**




**Выява, якая сумяшчаецца**



*Алімпіяда сярод навучэнцаў па фінансавай граматнасці*

# Ведай свае грошы!

НАЦЫЯНАЛЬНЫ БАНК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## ЯК ПРАВЕРЫЦЬ САПРАЎДНАСЦЬ БАНКНОТ

### Чацвёрты спосаб. Правяраем пры дапамозе прыбораў.



СПОСАБЫ ДРУКУ

МІКРАТЭКСТ

МАЛЮНАК У УФ-ПРОМНЯХ

## НАВЕДВАННЕ “БЕЛАГРАПРАМБАНКА”

белагропромбанк
традиции будущего









# ЭКОНОМИЧЕСКИЕ ЗАГАДКИ

| | | |
|---|---|---|
| Половинку от зарплаты<br>Называют как, ребята?<br><br>АВАНС | Стал владельцем, братцы, я — Вот завода…<br><br><br>АКЦИЯ | Будут целыми, как в танке,<br>Сбереженья ваши в…<br><br><br>БАНКЕ |
| В этой фирме все бывают,<br>Бланк сначала заполняют,<br>Вносят в кассу платежи.<br>Что за фирма, подскажи?<br><br><br>БАНК | Та бумага не простая,<br>И владелец её знает,<br>Что она ему раз в год<br>Дивиденды принесёт.<br><br>АКЦИЯ | В фирме прибыль он считает,<br>Всем зарплату начисляет.<br>И считать ему не лень<br>Все налоги целый день.<br><br>БУХГАЛТЕР |
| Он финансовый факир,<br>В банк к себе вас ждёт…<br><br>БАНКИР | Из какого аппарата<br>Выдаётся нам зарплата?<br><br><br>БАНКОМАТ | В море коварном товаров и цен<br>Бизнес-корабль ведёт…<br><br>БИЗНЕСМЕН |
| Сколько купили вы колбасы,<br>Стрелкой покажут вам точно…<br><br>ВЕСЫ | Расчёт зарплаты — знать пора — Проводят в срок…<br><br>БУХГАЛТЕРА | Дела у нас пойдут на лад:<br>Мы в лучший банк внесли свой…<br><br>ВКЛАД |

# Самыя незвычайныя грошы

Многія сцвярджаюць, што грошы сталі адным з самых важных вынаходстваў чалавецтва. З іх дапамогай мы навучыліся абменьвацца таварамі. Сёння мы маем магчымасць набыць што заўгодна на свеце, хапала б гэтых самых жаданых паперак або нулёў на рахунку. Асноўная маса грошай на зямлі мае даволі традыцыйны выгляд. Яны выкананы або ў выглядзе папяровых купюр, або ў выглядзе металічных манет. Даўно ўжо прайшлі часы, калі дзе-нідзе можна было набыць што заўгодна за люстэрка ды пацеркі. Тым не менш і сёння ў абароце некаторых краін свету знаходзяцца вельмі дзіўныя грошы.



**В'етнамскія Зялёныя маркі.** Дзіўна, але такімі грашыма самі жыхары В'етнама не змогуць расплаціцца за любы тавар. За гэтыя маркі можна купіць толькі некаторыя канкрэтныя рэчы. Уся справа ў тым, што ў кожнай банкноты з краю ёсць адрыўныя купоны. Кожны з іх можна абмяняць на тую рэч, якая і пазначана на грошах. Да прыкладу, Зялёную Марку могуць выдаць на набыццё адзення. Пры гэтым адрыўныя купоны даюць магчымасць набыць толькі штаны, паліто, шкарпэткі і іншыя падобныя рэчы.




**Сенцінніалі.** Гэта былі адзіныя ў свеце драўляныя грошы. Справа ў тым, што пасля Першай сусветнай вайны Германія імкнулася ўсімі сіламі "падняць" свой Рейхсбанк. Бо трэба было выплачваць кампенсацыю ўсім пацярпелым краінам. У тыя часы немцы друкавалі грошы на ўсім, што толькі выпадала для гэтых мэтаў. Але менавіта дрэва стала самым незвычайным матэрыялам.




**Фунт Льюіса.** Гэтыя грошы былі названыя ў гонар аднайменнага англійскага гарадка. У свой час мэрам там быў хітры прадпрымальнік Майкл Чарцье. Ён прыдумаў, як лепш развіць невялікія традыцыйныя крамы свайго гарадка. Для гэтага мэр увёў у сваіх уладаннях уласную валюту, якую так і назваў - фунт Льюіса. Гэтымі грашыма гараджане маглі расплаціцца за любы тавар у межах Льюіса, а таксама аплаціць рахункі.

## Долар Дыснея.

Дысней стварыў цэлы казачны свет. А што ж за свет без уласнай валюты? Долар Дыснея прыраўнены па намінале да долара ЗША. Выпускаюцца купюры вартасцю ў 1, 5, 10 і 50 адзінак. Але выкарыстоўваць іх можна толькі ў тэматычных дыснэеўскіх парках, на курортах, круізных караблях і на прыватным востраве Дыснея, Castaway Cay. Гэтая валюта была створана ў 1987 годзе. На купюрах замест традыцыйных для Амерыкі прэзідэнтаў выявы мультыплікацыйных герояў - Мікі Маўса, Гуффі і Міні.







**Чылійскі песа.** Хто сёння можа назваць гэтую валюту дзіўнай? Каб зразумець гэта, трэба вярнуцца ў недалёкі яшчэ ад нас 2008 год. Тады ўсё стане ясна, а валюта сапраўды здасца незвычайнай і смешнай. Бо тады пры чаканцы манет на гравюры была дапушчаная прыкрая памылка. У выніку выйшла каля 50 мільёнаў манет вартасцю ў 50 песа з надпісам "Рэспубліка Чыі" (Republica de Chiie). Кіраўнік манетнага двара быў звольнены, а самі манеты сталі аб'ектам “палявання” нумізматаў. За іх сёння просяць двайны намінал.

Дом, у якім утульна ўсім!
berezino2.school.by vk.com/club59543714 № 8, I чвэрць 2017/2018 нав. года

# ТВАЕ ПЕРШЫЯ ФІНАНСЫ




**ЧЫТАЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ**

Адкуль з'явілася слова "грош"?
Самыя незвычайныя грошы.

ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно"
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета "Школьная планета" выходзіць адзін раз у месяц.
Творчы калектыў клуба "Юны журналіст": Дудко Аляксандра, Жук Вольга, Вайцяховіч Лізавета, Власюк Марыя, Маркевіч Ірына